*иметь свою руку, держать в руках* (*быть в подчинении), взять в руки (заставить подчиняться), прибрать* к рукам (полностью подчинить), *попасть в руки, лапы* (оказаться во власти кого-то), отбиться от рук (выйти из подчинения. но и символ наказания - *рука не дрогнет, руки чешутся, поднимать руку*. Оценку в этих ФЕ нужно трактовать в зависимости от Я-ТЫ-ОН-грамматики (Э.Бенвенист): *держать в руках, взять в руки* – позитивная оценка с позиции Я, говорящего, субъекта. О*тбиться от рук* – отрицательная оценка с позиции Я-грамматики. *Попасть в руки, лапы* – отрицательная оценка с позиции Он-грамматики, субъекта, с которым производят действие. Жизнь – полная чаша – это символ, который объясняет целый ряд единиц языка: *испить чашу жизни, жизнь кипит, брызжет, переливается через край.*

Чем является символ для культуры и человеческого сознания? Древние знания были утрачены людьми. А символ – это способ сознательного освоения смыслов, в том числе и из-за пределов сознания, что дает человеку опору в этом мире, а разрушение символов губительно и для человека и для культуры. Так, *символ жизнь – сказка* разрушен в частушке *Мы рождены, чтоб Кафку сделать былью*.

ЛИТЕРАТУРА


1. Гадамер, Г.-Г. Актуальность прекрасного /Г. Гадамер. – М., 1991. – 473 с.
2. Лосев, А.Ф. Философия имени / А.Ф. Лосев. – М., 1990. – 516 с.
3. Потебня, А.А. Символ и миф в народной культуре / А.А. Потебня. – М. 2000, с. 312.
4. Телия, В.Н. Русская фразеология / В.Н. Телия. – М., 1996. – 382 с.


## РЭГІЯНАЛЬНАЯ АНАМАСТЫКА – БАЗА ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ БЕЛАРУСКІХ ВЁСАК


**Г.М. Мезенка**

*Віцебск, ВДУ*


Ніколі яшчэ пытанні вывучэння, захавання і развіцця гісторыка-культурнай спадчыны беларускага сялянства не былі такімі актуальнымі, як цяпер. Тлумачыцца гэта тым, што колькасны склад яго (сялянства) вельмі хутка зніжаецца. Як мы ўжо адзначалі, міграцыя ў гарады на пераважнай частцы тэрыторыі рэспублікі стала вызначальным дэмаграфічным працэсам у сельскай мясцовасці. Так, па даных агульнарэспубліканскага перапісу 1999 г., амаль 70% жыхароў Беларусі – гараджане. Хаця яшчэ ў 1970 г. працэнтныя суадносіны тых, хто жыве ў сельскай мясцовасці, з аднаго боку, і ў гарадах, з другога, у дэмаграфічнай структуры БССР складалі ад 43,4% да 56,6% [2].

Мэта гэтага даследавання – вызначэнне ролі рэгіянальнай анамастыкі ў стварэнні энцыклапедыі беларускіх вёсак.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У сувязі з гэтым паўстае пытанне аб стварэнні грамадскай суполкі накшталт расійскай “Энциклопедии российских деревень”, якая б аб’яднала гісторыкаў, этнографаў, географаў, культуролагаў, краязнаўцаў, іншых прафесіяналаў і, безумоўна, моваведаў, анаматолагаў у тым ліку. Адной з галін дзейнасці такой суполкі бачыцца арганізацыя навукова-практычных канферэнцый і выданне зборнікаў іх матэрыялаў, якія павінны ўтрымліваць тэксты дакладаў і паведамленняў па розных баках жыцця беларускіх вёсак і адпавядаць галоўнай задачы Суполкі – энцыклапедычнаму падыходу да вывучэння і апісання

Рэпазіторый ВДУ

беларускіх вёсак. Думаецца, узначаліць стварэнне такой суполкі па сілах акадэмічным інстытутам і дзяржаўным установам.

Знікаюць вёскі і іх назвы, а разам з імі імёны людзей, што ў іх жылі, найменні розных мікрааб'ектаў – лугоў, сенажацяў, лясоў, вуліц і інш., якія, будучы культурнымі здабыткамі беларускага народа, валодаюць вялікім пазнавальным патэнцыялам, своеасаблівым механізмам "запамінання" і "захоўвання" сацыякультурнай інфармацыі, якую даследчык можа умела здабываць і навукова каменціраваць. У скарбніцу родных назваў папярэднія пакаленні складалі свае вераванні, паданні, здабыткі гістарычных падзей. Анамастыкон – гэта своеасаблівая споведзь жыхароў пэўнага краю. Нельга не пагадзіцца з прафесарам Н.А. Максімчук, што "агульнамоўны (агульнасістэмны) статус уласнага імені толькі часткова можа служыць арыенцірам у вызначэнні месца оніма ў структуры канкрэтнай моўнай асобы. Гэтыя паняцці звязваюць значна больш складаныя адносіны, чым адносіны прамой адпаведнасці…" [1, 10].

Таму ўсебаковае вывучэнне анамастыкі беларускіх вёсак – адна з найважнейшых задач сучаснасці. Пытанні рэгіянальнай анамастыкі ўсё больш актыўна прыцягваюць увагу беларускіх даследчыкаў (дарэчы будзе тут адзначыць, што ў Расіі рэгіянальны кампанент уключаны ў праграмы агульнаадукацыйных школ, што па сутнасці абазначае важнасць для фарміравання асобы ведаў гэтага тыпу), сярод якіх не толькі імёны добра вядомых анамастаў, такіх, як В.П. Лемцюгова, Р.М. Казлова, Н.А. Багамольнікава, І.Л. Капылоў, А.Ф. Рогалеў, І.Э. Ратнікава, В.В. Шур, а і маладых навукоўцаў. Не апошнюю ролю ў гэтай справе адыграла міжнародная навуковая канферэнцыя "Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць", якую ладзіў у красавіку 2010 г. Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.

Распачатая намі работа па выкананні беларуска-рускага праекта "Віцебшчына і Смаленшчына ў моўных, літаратурных і культурных кантактах" паказала, што адной з цэнтральных задач у вывучэнні рэгіянальнай анамастыкі павінна стаць распрацоўка спосабаў выяўлення тых ведаў, той інфармацыі, носьбітамі якіх з'яўляюцца рэгіянальныя анамастычныя адзінкі. На думку выканаўцаў праекта, такім спосабам можа быць спосаб рэканструкцыі асацыятыўна-культурнага фону рэгіянальных анамастычных адзінак [1, 11]. Рэалізацыя гэтага спосабу патрабуе 1) стварэння банка зыходных звестак на аснове суцэльнага анкетавання (вуснага і пісьмовага) мясцовых жыхароў; 2) праверкі, удакладнення, дабаўлення і абагульнення шляхам супастаўлення звестак з розных крыніц; 3) публікацыі падрыхтаваных да друку матэрыялаў у спецыяльным перыядычным краязнаўчым выданні; 4) уласна асацыятыўнага эксперыменту.

Вяікая роля ў гэтай працы адводзіцца таксама краязнаўчай рабоце, якая на тэрыторыі Віцебшчыны мае даўнюю гісторыю. Зараджэнне мясцовага краязнаўства неабходна аднесці да сярэдзіны XIX ст. За гэты час яно набыло сапраўдную шырыню і навуковую глыбіню. У розныя перыяды краязнаўства перажывала этапы большага або меншага развіцця (бывалі і выпадкі поўнай забароны), аднак цікавасць да яго не згасала ніколі. У спецыялістаў і краязнаўцаў-аматараў назапашаны вялікі вопыт па вывучэнні гістарычнага мінулага гарадоў і вёсак Віцебшчыны, разнастайнай дзейнасці іх жыхароў, эканомікі і прыроды краю, мовы і культуры яго насельнікаў.

Рознааспектнае вывучэнне роднага краю абумовіла станаўленне такіх навуковых напрамкаў, як прыродаведчае краязнаўства, гістарычнае краязнаўства, літаратурнае краязнаўства, лінгвістычнае краязнаўства. У апошнія гады актывізуюцца і іншыя, не менш важныя, краязнаўчыя напрамкі, да ліку якіх можна аднесці захаванне помнікаў гісторыі і культуры, музейную справу, выяўленне і выкарыстанне архіўных матэрыялаў, выдавецкую і прапагандысцкую дзейнасць.



Рэпазіторый ВДУ

Пры гэтым ва ўсе часы цанілася дапаўненне прафесійных даследаванняў асабістымі, часта па-свойму адзінымі ўспамінамі, назіраннямі і пошукамі старажылаў, чые прафесійныя інтарэсы звычайна ляжаць за межамі гуманітарнай навукі. Часта гэта адзіны даступны шлях да гістарычных звестак аб населеным пункце, асабліва невялікім.”Вопыт паказвае, – лічаць даследчыкі, – што такім чынам можна сабраць вельмі цікавы матэрыял” [3, 15].

**Заключэнне.** Абавязак спецыялістаў-анамастаў і краязнаўцаў – садзейнічаць папулярызацыі анамастычна-краязнаўчых ведаў праз стварэнне анамастычнай энцыклапедыі пэўнай мясцовасці, якая дапаможа асвятліць розныя бакі жыцця беларускіх вёсак, захаваць крупінкі знікаючых на нашых вачах сведчанняў мінуўшчыны беларускага народа, атрымаць рэальнае ўяўленне пра змест рэгіянальных фонавых ведаў, што спадарожнічаюць тэрытарыяльна прымацаваным анамастычным адзінкам, і месцы гэтых ведаў у структуры моўнай асобы. У той жа час, выкарыстаўшы думку В.Э. Сталтмане, без перабольшвання можна сказаць, што “лексікаграфічная інвентарызацыя ўласных імён розных разрадаў з’яўляецца асновай далейшага развіцця анамастыкі ўвогуле” [4,3].

ЛІТАРАТУРА

1. Максимчук, Н.А. О региональных фоновых знаниях в структуре языковой личности и способах их выявления / Н.А. Максимчук // Материалы международного семинара “Витебщина и Смоленщина в языковых и культурных контактах: история и современное состояние” (Смоленск, 18 ноября 2010 г.). – Смоленск: СмолГУ, 2010. – С. 7-11.
2. Мезенка, Г.М. Гарадскі і сельскі гаданімікон: падабенства і адрозненні / Г.М. Мезенка // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования: Материалы междунар.науч.-метод.конф. В 2 ч. Ч.1. – Брэст, 2006. – С. 18-24.
3. Панцялейка, А. Наш край – Браслаўшчына: Дапаможнік па раздзелу “Наш край” праграмы па гісторыі Беларусі для настаўнікаў сярэдніх школ / А. Панцялейка, К. Шыдлоўскі. – Браслаў, 1993. – 108 с.
4. Сталтмане, В.Э. Ономастическая лексикография / В.Э. Сталтмане / Институт языкознания; Отв.ред. А.В. Суперанская. – М.: Наука, 1989. – 116 с.

## РОЛЬ ГРАММАТИЧЕСКИХ КАТЕГОРИЙ В СОЗДАНИИ СИНЕРГЕТИЧНОСТИ ПОЭТИЧЕСКОГО ТЕКСТА

**Е.Ю. Муратова**
*Витебск, ВГУ*

Описание грамматики дает возможность установить систему соответствий между формально-грамматическим и содержательным уровнем поэтического произведения. М. Хайдеггер писал: «Язык обладает той особенностью, что мы в нем живем, ему доверены, обычно не направляя при этом на него свое внимание, и, таким образом, не замечаем его в его самости» [1. 42]). Выход из этого положения М. Хайдеггер находит в поэзии. В частности, грамматические категории в поэтическом тексте стремятся к тому, чтобы стать сущностными характеристиками создаваемого художественного мира.

Нам кажется очень верной мысль Михаила Эпштейна о тех моментах мышления, которые меньше всего контролируются самим мышлением, предзаданы

Репозиторий ВГУ